# Рэцэнзіі

Ю.І. Внуковіч. **Літоўцы Беларусі: этналагічнае даследаванне.** Мн.: Беларуская навука, 2010. 170 с.

Манаграфія беларускага этнолага Юрыя Іосіфавіча Внуковіча «Літоўцы Беларусі: этналагічнае даследаванне» прысвечана маларапрацаванай у айчыннай этналагічнай і гістарычнай навуцы тэме гісторыі і культуры літоўскай этнічнай супольнасці ў Беларусі.

Беларусь з’яўляецца поліэтнічнай тэрыторыяй, на якой разам з беларусамі некалькі стагоддзяў пражываюць і іншыя этнічныя групы. На сучасным этапе менавіта міжэтнічныя стасункі з’яўляюцца адной з найбольш актуальных тэм даследавання ў гуманітарнай навуцы. Абвастрэнне міжэтнічных адносін і рост нацыянальнага экстрэмізму становяцца сучаснымі еўрапейскімі і сусветнымі рэаліямі. На гэтым фоне зварот да мірнага суіснавання розных этнічных супольнасцей і вывучэнне гістарычнага вопыту такіх адносін, безумоўна, актуальныя. Узмацняе навуковую актуальнасць манаграфіі таксама той факт, што яна прысвечана літоўцам Беларусі, пра якіх, нягледзячы на дастаткова значнае месца ў этнічнай гісторыі беларусаў, у айчыннай гістарыяграфіі фактычна няма спецыяльных работ. Выключэннем з’яўляюцца энцыклапедычныя артыкулы і навуковыя працы В. Скардзіса часоў беларусізацыі, якія ўжо страцілі пэўную навуковую вартасць.

Манаграфія складаецца з трох глаў: аналітычны агляд літаратуры і крыніц, этнічная гісторыя літоўцаў Беларусі і іх традыцыйная культура.

У першай главе аўтар падрабязна характарызуе гістарыяграфію праблемы. Праз яе аналіз Ю.І. Внуковіч прадэманстраваў супярэчлівасць працэсу навуковага акрэслення прасторы пражывання літоўцаў Беларусі, уплыву на гэтую праблему нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў розных зацікаўленых бакоў. «Гэтыя даследчыкі былі сучаснікамі працэсу актыўнага абеларушвання літоўскага насельніцтва беларуска-літоўскага этнічнага памежжа. Таму многім з іх часта даводзілася сустракаць толькі беларускамоўных або польскамоўных жыхароў там, дзе іх папярэднікі яшчэ маглі зафіксаваць наяўнасць літоўскамоўнага насельніцтва…» (с. 13).

Аўтар падкрэслівае думку аб тым, што тэма літоўцаў у Беларусі яшчэ не знайшла належнага адлюстравання ў беларускай гістарыяграфіі. У артыкулах А. Вабішчэвіча, В. Лукіна, І. Пушкіна, С. Токця, У. Тугая, агульных энцыклапедычных артыкулах В. Цітова і І. Карашчанкі ў большасці разглядаецца літоўская супольнасць у Беларусі ў перыяд другой паловы XIX – першай трэці XX ст.

Пры разглядзе метадаў даследавання аўтар надае вялікае значэнне дыфузіянізму з акцэнтам на такія этнічныя працэсы, як асіміляцыя, міграцыя і інтэграцыя (с. 31). Дадзены падыход, з аднаго боку, сведчыць аб паступовым зруху беларускай этналогіі ад канонаў эвалюцыянізму, а з другога – аб захаванні аўтарам прыналежнасці да класічных традыцый сінтэзу эвалюцыяніцкай і дыфузіяніцкай канцэпцый стваральнікаў сучаснай айчыннай этналагічнай навукі.

У другой главе манаграфіі – «Этнічная гісторыя літоўцаў Беларусі» ўвага засяроджана на формах і змесце шляхоў стварэння гэтай супольнасці, вызначэнні арэала іх рассялення на тэрыторыі Беларусі. На падставе шырокага археалагічнага, мовазнаўчага і гістарычнага матэрыялу Ю.І. Внуковіч выдзяляе чатыры этапы этнічнага развіцця літоўскай супольнасці Беларусі: 1) XV – першая палова XVII ст., характэрнай рысай якога была моўная асіміляцыя літоўцаў беларусамі ў ВКЛ; 2) другая палова XVII–XVIII ст., калі ўплыў беларускай мовы і культуры паступова замяняецца польскай; на думку аўтара, стварэнне літоўскай супольнасці Беларусі адбывалася двума шляхамі. Па-першае, гэта фарміраванне літоўскай этнічнай групы Беларусі яшчэ з часоў Сярэднявечча, калі паўночны захад нашай краіны быў заселены балцкімі этнічнымі супольнасцямі. У гэтым працэсе актыўны ўдзел прынялі яцвяжскія этнічныя супольнасці дайноваў і заходне-

балцкія (прускія) супольнасці борцей і скаловаў. Аўтар абгрунтоўвае свае высновы пераканаўчым тапанімічным і гістарычным матэрыялам.

Па-другое, на працэс фарміравання літоўцаў Беларусі аказалі ўплыў і міграцыйныя фактары. Ю.І. Внуковіч выдзяляе дзве міграцыйныя хвалі літоўцаў у Беларусь: эканамічная міграцыя на рубяжы XIX–XX стст. найбольш масавая, падчас якой мігрыравала некалькі тысяч літоўцаў, і міграцыя літоўцаў-бежанцаў у час Першай сусветнай вайны.

Разглядаючы пытанне асаблівасцей этнічнага развіцця беларускіх літоўцаў, аўтар выдзяляе некалькі этапаў і характэрных для іх рыс міжэтнічных адносін літоўцаў з беларусамі. Першапачаткова адбываўся працэс моўнага і культурнага ўзаемаўплыву, калі кожная этнічная супольнасць набывала найбольш дасканалыя (па іх разуменню) элементы культуры іншай этнічнай групы. Адным з яскравых прыкладаў такой культурнай інтэграцыі стала дзуканне беларускіх літоўцаў. Гэтая фанетычная з’ява ўзнікла пад моцным моўным уплывам беларусаў яшчэ ў XIV–XV стст. З другога боку, адбывалася запазычанне беларусамі літоўскай гаспадарчай лексікі (назвы пабудоў і іх частак – *клуня*, *пуня*, земляробчая і жывёлагадоўчая лексіка – *дзірван*, *сцірта*, назвы прадуктаў харчавання і напояў – *кумпяк*, *кіндзюк*, тэрміны рыбалоўства – *буч*, *венцер* і некаторыя назвы народных звычаяў – *бонда*).

На думку Ю.І. Внуковіча, працэсы моўных адносін паміж беларусамі і літоўцамі Беларусі мелі характар абеларушвання. Гэта адбывалася ў сувязі з тым, што беларуская мова мела статус рэгіянальнай і з’яўлялася мовай камунікацыі ва ўсе гістарычныя перыяды. Аўтар аргументавана сцвярджае, што працэс абеларушвання літоўцаў Беларусі ішоў паралельна паланізацыі, якая захапіла як літоўцаў, так і беларусаў. Галоўным фактарам абеларушвання была колькасная перавага беларусаў і ў сувязі з гэтым змешаныя шлюбы.

Працэс абеларушвання літоўцаў крыху замарудзіўся ў пачатку XX ст., падчас уздыму літоўскага нацыянальнага руху. Аўтар лічыць, што гэта адбылося пад уплывам сістэмы адукацыі на літоўскай мове, якая ствралася на Беларусі, распаўсюджвання літоўскіх газет і дзейнасці культурна-асветніцкіх таварыстваў. Ю.І. Внуковіч звяртае ўвагу на рознасць этнічных працэсаў у літоўцаў Заходняй і Усходняй Беларусі ў 1920-х – пачатку 1930-х гг. Калі першыя адчувалі значны ціск паланізацыі, то ў межах БССР падчас беларусізацыі, на думку аўтара, Мінск ператвараецца ў сталіцу літоўцаў СССР. Былі створаны ўмовы для развіцця своеасаблівасцей культуры літоўцаў Беларусі.

Асабліва каштоўным з’яўляецца дэмаграфічны аналіз літоўскай меншасці Беларусі ў другой палове XX ст. На падставе дадзеных перапісаў 1959, 1970, 1979, 1989 і 1999 гг. Ю.І. Внуковіч дае цэласную характарыстыку колькасным зменам у структуры літоўцаў Беларусі па гендарнаму, узроставаму, моўнаму і крытэрыю месца пражывання. Аўтар прыходзіць да высновы аб неспрыяльных дэмаграфічных умовах літоўцаў на фоне іншых значных этнічных меншасцей Беларусі.

Трэцяя глава манаграфіі прысвечана мове і традыцыйнай культуры літоўцаў Беларусі. Аўтар дае падрабязны моўны аналіз літоўскай этнічнай групы, выяўляе асаблівасці гутарковай мовы, моўныя дыялекты беларускіх літоўцаў (гервяцкі, воранаўскі/пеляскі і дзятлаўскі) і тэрыторыю іх распаўсюджвання на Беларусі.

Разглядаючы духоўную культуру літоўцаў Беларусі, Ю.І. Внуковіч прыходзіць да высновы аб значным язычніцкім кампаненце ў складаным перапляценні з хрысціянствам. Каляндарная абраднасць літоўцаў знаходзіць шэраг паралелей з беларускай.

На думку аўтара, найбольш спецыфічныя рысы знаходзяцца ў міфалагічных уяўленнях літоўцаў. Уяўленні аб *вяльнясе*, *айтварасе*, *скальсінінкасе*, *кутасе*, *спарыжусе* і *рагане* надаюць літоўскай міфалогіі на Беларусі культурную своеасаблівасць.

Багаццем і своеасаблівасцю характарызуюцца фальклор і народныя веды літоўцаў Беларусі. Ю.І. Внуковіч лічыць, што найбольш архаічнай часткай іх фальклору з’яўляюцца галашэнні.

У дачыненні матэрыяльнай культуры літоўскай меншасці аўтар схіляецца да думкі аб сходных яе рысах з беларускай. Як і ў беларусаў, асноўнымі занняткамі былі земляробства і жывёлагадоўля, дадатковымі – промыслы і рамёствы. Падобнымі былі формы калектыўнай дапамогі, комплекс харчавання, адзення і архітэктурныя традыцыі.

Літоўцы Беларусі, на думку аўтара, былі актыўна ўключаны ў працэс этнакультурнай інтэграцыі, што і прывяло да з’яўлення вялікай колькасці агульных рыс з беларусамі ў іх традыцыйнай культуры.

Манаграфія з’яўляецца значным укладам у развіццё беларускай этналогіі. Праведзены комплексны аналіз этнічнай гісторыі і традыцыйнай культуры літоўцаў Беларусі. У навуковы абарот уведзена значная колькасць крыніц з архіваў аддзела этналогіі Інстытута гісторыі Літвы, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, рукапіснага фонду літоўскага фальклору Інстытута літоўскай літаратуры і фальклору. Аўтар шырока выкарыстаў матэрыял літоўскай этналогіі і гісторыі, які да гэтага часу не быў уведзены ў навуковы абарот. З 2005 г. ён актыўна праводзіць палявыя даследы сярод літоўцаў Беларусі, што адчуваецца ў даследаванні.

Манаграфія выканана ў класічным для айчыннай этналогіі выглядзе з выкарыстаннем комплекснага аналізу археалагічных, этнаграфічных, лінгвістычных і гістарычных матэрыялаў.

***С.А. Захаркевіч***,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры этналогіі,
музеялогіі і гісторыі мастацтваў